УДК 94 (476) "1937/1939"

***А.П. ДЗМІТРУК***

# МЕХАНІЗМ ФАРМІРАВАННЯ ПАРТЫІ "ЛАГЕРА НАЦЫЯНАЛЬНАГА АБ'ЯДНАННЯ" НА ПРЫКЛАДЗЕ ЗАХОДНЕБЕЛАРУСКІХ ЗЯМЕЛЬ

*Лагер Нацыянальнага Аб'яднання (далей ЛНА; па-польску "Obóz Zjednoczenia Narodowego") – гэта польская ўрадавая партыя так званай "групы пілсудчыкаў", якая дзейнічала і на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў 1937 – 1939 гг. Механізм яе фарміравання дазваляе вызначыць не толькі асаблівасці структуры, ролі і функцыі партыі ў палітычнай сістэме, але і сапраўдныя мэты ўрадаў. Канцэнтрацыя польскіх грамадскіх сіл, скаардына-*

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

*ванасць з дзяржаўнай уладай, іерархічнасць пабудовы самой партыі зрабілі яе сапраўднай прыладай паланізацыйнай палітыкі на заходнебеларускіх землях.*

**Уводзіны**

Даследаванне этнасацыяльных і палітычных працэсаў у Заходняй Беларусі ў 1921 – 1939 гг. без комплекснага вывучэння польскіх партый урадавай арыентацыі немагчыма. Адной з іх стаў ЛНА, які задумваўся як прылада працы ўрада Польшчы ў грамадскай сферы, а на нашых землях – як інструмент цэнтралізацыі і паланізацыі, таму цікаўнасць выклікае працэс яго фарміравання і ўнутраная канструкцыя.

**Асноўная частка**

21 лютага 1937 г. у сваім выступленні па радыё А. Коц ад імя новага маршала Рыдз-Смігла абвясціў аб стварэнні новай палітычнай групоўкі пілсудчыкаў. Але на рэгіянальным узроўні першапачаткова ніякіх крокаў не назіраецца. Затое інтэнсіўныя дзеянні адбываюцца на цэнтральным узроўні. Створаны штаб партыі, які займаўся арганізацыйнымі справамі.

Першыя кадры членаў ствараліся шляхам падбору. Членамі лічыліся ўсе асобы, якія ўдзельнічалі ў Варшаўскім з'ездзе 1 сакавіка 1937 г. або напярэдадні стварэння акругі ці аддзела былі запрошаны да супрацоўніцтва або будуць запрошаны на першы лакальны сход. На арганізацыйным паседжанні 2 сакавіка пастанавілі, што ўсе упаўнаважаныя павінны былі прадставіць падзел на акругі і кандыдатаў у члены акруговага прэзідыума [1, с. 84].

У сувязі з тым што ЛНА ставіў перад сабой мэту правесці кансалідацыю польскага грамадства, яго кіраўнікі патрабавалі ўлічваць прынцып раўнамернасці адбору членаў з усіх груп грамадска-прафесійнай структуры (рамеснікі, купцы, вольныя прафесіі, работнікі фізічнай і разумовай працы) [1, с. 84]. Падбор членаў станавіўся прынцыповай справай для новастворанага лагера. Імі маглі стаць толькі этнічныя палякі, пры гэтым нельга было дапусціць у арганізацыю асоб з адмоўнай рэпутацыяй [1, с. 81].

Сфарміраваныя акруговыя прэзідыумы павінны былі неадкладна прыступіць да стварэння груп у акруговых гарадах і аддзелаў у гарадах і мястэчках сваёй акругі. Але напярэдадні арганізацыйных сходаў трэба было папярэдзіць прэзідыум Варшаўскай гарадской арганізацыі ЛНА, каб яна магла накіраваць свайго прадстаўніка з мэтай зацвердзіць іх склад. Канчатковы падзел на акругі на ўсёй тэрыторыі дзяржавы адбыўся ў Варшаве.

На заходнебеларускіх землях яны былі створаны ў Брэсце (№ 36), Пінску (№ 37), Навагрудку (№ 38), Вільні (№ 39), Гродна (№ 41), Беластоку (№ 42) [1, с. 71-72]. 14 красавіка адбыўся арганізацыйны сход гарадской арганізацыі ЛНА ў Брэсце. Палкоўнік А. Коц зацвердзіў прэзідыум Брэсцкай акругі, у склад якой увайшло 10 прадстаўнікоў розных прафесій. А 19 красавіка была створана акруговая гарадская арганізацыя ў Вільні. Час з'езда адкладваўся толькі для таго, каб ён адбыўся ў гадавіну вызвалення Вільні. У дзень стварэння гарадская арганізацыя ЛНА ўжо налічвала 711 членаў, якія ўдзельнічалі ў сходах. 7 мая 1937 г. была створана Беластоцкая акруга, 23 мая – у Пінску, 9 чэрвеня – у Гродна і толькі 3 ліпеня 1937 г. – у Навагрудку 47 [1, с. 57, 61, 65]. Адначасова фарміруюцца аддзелы у іншых гарадах.

У сувязі з тым што на некаторых абшарах адміністрацыйныя ўлады патрабавалі зарэгістраваць ствараемыя адзінкі і падаць склад праўлення, кіраўніцтва

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

тлумачыла, што ЛНА як палітычная арганізацыя не падлягала праву аб таварыствах, таму не абавязана абвяшчаць факт стварэння ячэек уладам. Прытрымлівацца ўказанага закону трэба было толькі пры арганізацыі публічных сходаў.

Пры фарміраванні тэрытарыяльных аддзелаў ЛНА кіраўнікі акцыі звярнуліся да арганізацыйнай формы беспартыйнага блока супрацоўніцтва з урадам – секцыям. Але яны сталі разумецца як дапаможныя органы працы прэзідыумаў. Рашэнні і прапановы секцый набіралі моц толькі ў выглядзе пастаноў прэзідыума. Колькасць і характар секцый павінны былі залежаць ад істотных патрэб дадзенай тэрыторыі.

Планавалася, што ў секцыях павінны былі працаваць вядомыя асобы, знаўцы некаторых сфер жыцця, якія былі ахоплены дзейнасцю грамадскіх арганізацый. Узначальваў секцыю адзін з членаў прэзідыума. Грамадскую секцыю, якая павінна была адыгрываць ролю каардынацыйнага органа мясцовага грамадскага жыцця, трэба было так укамплектаваць, каб персанальны склад мог гарантаваць намечаны эфект працы па кансалідацыі. Спецыяльную ўвагу трэба звярнуць на лакальныя аддзелы таварыстваў вышэйшай карыснасці, жаночыя арганізацыі, ваенныя. Аналагічна вырашаць справы ў гаспадарчым жыцці.

Як ужо адзначалася, секцыі ў ЛНА разумеліся як выканаўчы орган прэзідыумаў, у той час як у ББСУ – як орган працы. Для выканання канкрэтных спраў прэзідыум аддзела меў права ўключаць членаў партыі ў "групы працы". Група планавалася як супрацьлегласць масавым саюзам, якія абапіраліся на бясплённае мітынгаванне. Яна разглядалася як функцыя секцыі і павінна была прыводзіць у дзеянне распрацаваныя праз яе планы.

"Група працы" ахоплівала не больш як 20 членаў. На чале кожнай стаяў кіраўнік, прызначаны прэзідыумам аддзела. Ад яго патрабавалася дасканалае веданне членаў групы, здольнасць уцягнуць іх у працу, уменне планаваць працу і глыбокае пачуццё адказнасці за групу. Кіраўнік групы па меры неабходнасці склікаў сходы, на якіх быў старшынёй, прымаў справаздачы, размяркоўваў працу так, каб кожны член групы быў ахоплены. Для ажыццяўлення апекі над групай прэзідыум прызначаў са свайго складу члена, які адказваў за працу пэўнай групы. Па яго прапанове прэзідыум ствараў групы рэалізацыйнай працы, прызначаў і знімаў кіраўнікоў груп.

Як адзначаў шэф лагера, праца секцыі і груп цесна звязана: пасля года працы ў секцыях кожны член павінен хаця б паўгода быць членам групы рэалізацыйнай працы. Такім чынам, выкананне плана стала крытэрыем не толькі працы груп, але і секцый, якую ажыццяўляў прэзідыум.

Да 1 кастрычніка 1937 г. скончыўся перыяд арганізацыйных прац у 40 акругах, было створана 215 аддзелаў [1, с. 29].

Арганізацыю цэнтральных улад ЛНА і кіраўнічай структуры акрэслівалі загады шэфа лагера № 1 і 2 [2], але канчаткова яны былі ўрэгуляваны рэгламентам арганізацыйнай структуры ЛНА ад 21 лютага 1938 г. [3, с. 22].

Кіруючыя ўлады складаліся з шэфа і яго намеснікаў, а таксама з Галоўнай рады і яе прэзідыума. У арганізацыйных структурах ЛНА дзейнічалі верыфікацыйная і рэвізійная камісіі, таварыскія суды, бюро даследаванняў і планавання, шэф штаба партыі. Рэгламентам былі ахоплены абшар дзейнасці і функцыі тэрытарыяльных улад.

Шэф ЛНА пры супрацоўніцтве з Галоўнай радай устанаўліваў арганізацыйныя прынцыпы і праграмы; ажыццяўляў поўнае кіраўніцтва акцыяй лагера і прадстаўляў яе ў знешніх адносінах; па прадстаўленню Галоўнай рады прымаў у

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

партыю грамадскія арганізацыі; прызначаў членаў Галоўнай рады, а таксама старшынь камісій і іх намеснікаў, прэзідыум Галоўнай рады; устанаўліваў і звальняў усе ўлады і арганізацыі ЛНА, за выключэннем тых, якія створаны нізавымі ўладамі; устанаўліваў членаў Акруговай рады; кіраваў уладамі і арганізацыямі ЛНА, якія яму падпарадкоўваліся.

Колькасць намеснікаў вызначаў сам шэф арганізацыі. Яны прызначаліся шэфам, адказвалі перад ім за выкананне давераных ім функцый у межах, акрэсленых шэфам.

У склад Галоўнай рады ўваходзілі: а) намеснік; б) прызваныя з членаў ЛНА галоўныя прадстаўнікі грамадства і дзеячы лагера; в) прэзідыум парламенцкай групы ЛНА; г) старшыня Галоўнай рэвізійнай камісіі; д) шэф бюро даследаванняў і планавання; ж) шэф штаба ЛНА; з) старшыні акруг; к) шэф аддзела па справах прафесійна-гаспадарчага руху; л) шэф аддзела па справах моладзі. Акрамя гэтага, ў склад уваходзяць кааптаваныя члены з бюро даследаванняў і планавання.

Задачай Галоўнай рады стала супрацоўніцтва з шэфам ва ўсталяванні праграм і арганізацыйных прынцыпаў лагера і ў коле праблем, прадстаўленых шэфам; выступленне з ініцыятывамі да шэфа лагера, прэзідыума рады і выбар членаў Галоўнай верыфікацыйнай і рэвізійнай камісій; па прапанове Галоўнай рэвізійнай камісіі зацвярджае справаздачы цэнтральных улад па фінансава-гаспадарчай дзейнасці.

У склад прэзідыума рады, акрамя намеснікаў шэфа і шэфа штаба, уваходзілі члены, прызваныя на адзін год шэфам ЛНА па прапанове і са складу Галоўнай рады. Ролю старшыні на яе пасяджэннях і прэзідыума выконваў сам шэф ЛНА або прызначаны ім намеснік, а сакратаром з'яўляўся шэф штаба ЛНА. Прэзідыум рыхтаваў справы, якія павінны былі ўносіцца на пленарны сход Галоўнай рады. З аднаго боку, ён меў права ад імя апошняй прымаць рашэнні ва ўсіх арганізацыйных справах, якія будуць прызнаны шэфам лагера як надзвычайныя, але з другога, складаў справаздачы перад радай. Такім чынам, прэзідыум быў падпарадкаваны радзе, яе працоўным органам. Аб гэтым жа сведчыць і той факт, што Галоўная рада па ўзгадненні з шэфам лагера ўхваляла рэгламент сваіх пасяджэнняў, рэгламенты для прэзідыума рады, для створаных ёй камісій, для Акруговай і Павятовай рад. Пленарнае пасяджэнне праходзіла 4 разы ў год, у перыяд, усталяваны шэфам лагера. Прэзідыум рады праводзіў пасяджэнні па меры неабходнасці, але не менш чым адзін раз у месяц. Для вырашэння некаторых праблем Галоўная рада вылучала са свайго склада камісію, старшыня якой прызначаўся шэфам лагера з членаў самой рады.

У якасці органа шэфа лагера, кіраўнік якога быў непасрэдна яму падпарадкаваны, выступала бюро даследаванняў і планавання ЛНА. Усе рэкамендацыі і інструкцыі ніжэйшым акруговым бюро цэнтральнае выдавала толькі праз улады штаба. Шэф бюро адказваў перад кіраўніком партыі за тэрміны распрацоўкі спраў і праблем, звязаных з акцыяй лагера і даручаных яму для выканання.

У сваю чаргу, кіраўнік штаба ЛНА з'яўляўся выканаўчым органам шэфа лагера. Ён непасрэдна падпарадкоўваўся кіраўніку партыі і адказваў толькі перад ім за ўвесь комплекс прац, якія выконваліся ў лагеры. Да задач штаба адносіліся: наданне накірунку дзейнасці акругам і яе каардынацыя; кантроль над выкананнем распараджэнняў штаба лагера; прадстаўленне перыядычных справаздач сваёй дзейнасці і падпарадкаваных штабу арганізацый.

Тэрытарыяльны падзел партыі фактычна адпавядаў адміністрацыйнаму падзелу дзяржавы. ЛНА падзялялася на акругі, павятовыя і мясцовыя аддзяленні.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Мясцовыя і павятовыя аддзелы не падзяляліся на меншыя адзінкі, а складаліся з мясцовых гуртоў і груп або толькі груп. Кожны член партыі належаў да адпаведнага мясцовага аддзялення згодна з месцам пражывання або працы. Размеркаваннем займаліся ўлады ЛНА. У гарадах, дзе не было аддзяленняў, члены партыі непасрэдна падпарадкоўваліся павятовым аддзелам. На чале акруг стаялі старшыні, якія прызначаліся шэфам лагера.

Галоўны лозунг – аб'яднанне ўсіх польскіх сіл для сумесных дзеянняў, узмацнення развіцця Польшчы. Прынцып аб'яднання – дабрабыт асобы залежыць ад дабрабыту дзяржавы. На погляд кіраўніцтва ЛНА, сутнасць недахопаў жыцця краіны заключаецца ў тым, што сілы польскага народа не былі належным чынам выкарыстаны і скаардынаваны, таму ЛНА імкнулася да перабудовы грамадства, каб даць магчымасць усім пластам насельніцтва дзейнічаць у імя грамадскага дабрабыту [2].

Аўтары канцэпцыі адзначалі, што ЛНА – палітычная арганізацыя, створаная для кіраўнічай ролі ў дзяржаве; з'яўляецца арганізацыяй, скаардынаванай з урадам Рэчы Паспалітай; мэта арганізацыі – стварэнне палітычнага руху, які імкнецца да грамадскай перабудовы Польшчы. ЛНА абапіралася на прынцып аўтарытэту кіраўнікоў, улічвала ў сваёй дзейнасці погляды кожнага з членаў партыі. Гэта арганізацыя "кіруючай дэмакратыі", яе асноўным структурна-арганізацыйным палажэннем з'яўляўся прынцып: "планавая групавая дзейнасць пад кіраўніцтвам правадыра пры актыўным супрацоўніцтве грамадзян" [4, с. 49].

## Заключэнне

Такім чынам, пры арганізацыі ЛНА замест класавага выкарыстаны нацыянальны прынцып, кіраўнічая роля ў дзяржаве належала этнічным палякам, аб'ядноўвала іх сілы на пэўнай тэрыторыі. Працэс фарміравання ЛНА адбываўся шляхам прызначэння, што прывяло да высокай ступені цэнтралізацыі, элітарнасці. Нягледзячы на тое што ЛНА абвяшчалася партыяй, яе мэтай стала стварэнне палітычнага руху і скаардынаванасць з урадам. Такім чынам, яна займала пасрэдную пазіцыю ў рамках палітычнай сістэмы.

Сувязі з адміністрацыяй не прасочваюцца напрамую, затое кіраўнікі грамадскіх арганізацый уключаны ў органы Рад ЛНА, аб чым сведчыць характар гарызантальных сувязей, на якія кіраўнікі ЛНА звярнулі асаблівую ўвагу пры пабудове ўнутранай структуры (прэзідыумы, іх склад, секцыі і групы працы).

Пры аналізе механізму фарміравання ЛНА выразна бачна стварэнне падвойнай структуры. З аднаго боку, гэта кіраўнікі, іх намеснікі, выканаўчыя органы, ім падпарадкаваныя, з іншага – Рады, якія мелі толькі дарадчы характар. Першая структура – жорстка цэнтралізаваная, падпарадкаваная шэфу лагера, яе базавай адзінкай былі аддзелы, другая – як бы аўтаномная ўнутры адпаведнага ўзроўню, падпарадкаваная кіраўнікам, яе базавая адзінка – група працы. Фактычна аб'ектам уздзеяння для першай структуры становяцца кіраўнікі польскіх грамадскіх арганізацый. Ідзе фарміраванне іерархіі ў польскім грамадстве, але адначасова сама партыя, аб'ядноўваючы ўсе нацыянальныя сілы, гарантавала ім кіраўнічую ролю ў дзяржаве. Канцэнтрацыя польскіх грамадскіх сіл, скаардынаванасць з дзяржаўнай уладай, іерархічнасць структуры самой партыі зрабілі яе сапраўднай прыладай паланізацыйнай палітыкі на заходнебеларускіх землях.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

## *СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ*

1. Дзяржаўны архіў Гродзенскай вобласці (ДАГВ). – Фонд 142. – Воп. 1. – Спр. 1. Звесткі старшыні гарадскіх арганізацый і партый аб ходзе арганізацыйнай працы.
2. Archiwum Akt Nowych (AAN). – OZN. – Syg. 2 Rozkazy organizacyjne 1–2.
3. ДАГВ. – Фонд 142. – Воп. 1. – Спр. 11. Рэгламент арганізацыйнай структуры ЛНА 21 лютага 1938 г.
4. AAN. — OZN. – Syg. 3. Biuletyn Organizacyjny 1–11.

Паступіў у рэдакцыю 05.06.2012 г.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова